кіраўнікоў дзіцячых мастацка-творчых калектываў, уключае сістэму тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў, накіраваных на развіццё творчых здольнасцей, а таксама на самарэалізацыю, самаразвіццё і самаактуалізацыю кожнай асобы. Неабходнасць вывучэння найноўшых педагагічных тэхналогій і прафесійных методык абумоўлена перш за ўсё кардынальнымі зменамі ў жыцці кожнай асобы і ўсяго грамадства, а таксама новымі патрабаваннямі да прафесійнай кваліфікацыі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

**Каралькоў М.А.**, *дацэнт*

## АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Факультэт мастацкай творчасці быў створаны ў 1986 годзе на базе былога факультэта культурна-асветніцкай работы. Асноўная мэта адкрыцця факультэта заключалася ў павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацкай культуры, забеспячэнні нашай рэспублікі спецыялістамі высокага прафесійнага ўзроўню. Па сутнасці гэта быў пераход да падрыхтоўкі спецыялістаў больш вузкай прафілізацыі, але на значна больш высокім прафесійным узроўні.

Ужо на першым пасяджэнні вучонай рады былі акрэслены асноўныя накірункі дзейнасці і падрыхтоўкі спецыялістаў. Спачатку мы дабіліся ўключэння ў дзяржаўны экзамен ігры на спецінструменце, а потым і прысваення лепшым выпускнікам нашай ВНУ кваліфікацыі выкладчыка спецыяльных дысцыплін.

Доўгі час Міністэрства культуры не давала дазвол на паступленне ў нашу ВНУ абітурыентам, якія скончылі музычныя вучылішчы. Але дзякуючы нашай настойлівасці такі дазвол мы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрымалі. Усё гэта дало станоўчыя вынікі пры падрыхтоўцы будучых спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

Мы можам ганарыцца многімі з нашых выпускнікоў, якія працуюць у сельскіх клубах і прафесійных калектывах усіх накірункаў. Гэта народныя артысты РБ Л.Бржазоўская, В.Траян; заслужаныя артысты РБ В.Пархоменка, Г.Радзько, Н.Кавалёва, В.Дайнека, В.Шчарыца і інш. Многія выпускнікі нашага універсітэта ўзначальваюць шматлікія мастацкія калектывы (В.Дрозд, В.Гладкая, І.Кірчук, А.Лойка, А.Навіцкая і інш), з'яўляюцца салістамі розных ансамбляў (М.Сацура, А.Крамко), выкладчыкамі сярэдніх навучальных устаноў культуры і мастацтва РБ (І.Семечка, А.Шохрына, І.Булашова, Л.Кузьміч, А.Карповіч і інш.), выкладчыкамі ВНУ (М.Кузьмініч, А.Карацееў, А.Занько, І.Мангушаў, У.Зяневіч, С.Гуткоўская, В.Бяляева і інш.). Тры выпускнікі паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

На сённяшні дзень на факультэце распачата падрыхтоўка бакалаўраў і магістраў; некаторыя выпускнікі нашага факультэта вучацца ў аспірантуры.

Вялікая ўвага ўдзяляецца стварэнню і адаптацыі вучэбных планаў па ўсіх спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Шмат планаў, у тым ліку і тыпавых, ствараліся ўпершыню (напрыклад, па мастацтву эстрады, бальнаму танцу, эстраднаму танцу). За час існавання факультэта былі адкрыты новыя спецыяльнасці, спецыялізацыі, прафілізацыі, кафедра мастацтва эстрады.

Новыя вучэбныя планы, створаныя на факультэце і зацверджаныя ў міністэрствах адукацыі і культуры, прадугледжваюць павышэнне агульнагуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Але, на наш погляд, гэтыя тыпавыя планы патрабуюць дапрацоўкі, чым мы і будзем займацца ў далейшым.

Сёння на факультэце працуюць 168 выкладчыкаў (з іх 23 дацэнты, 5 прафесараў, 16 кандыдатаў навук і адзін доктар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навук). У 1986 г. на факультэце працавалі толькі 5 кандыдатаў навук.

Амаль усе выкладчыкі прымаюць удзел у навуковых, навукова-метадычных, навукова-творчых канферэнцыях, працуюць над навуковымі комплекснымі тэмамі.

Асабліва трэба адзначыць канцэртную дзейнасць нашага факультэта. Можна смела сказаць, што факультэт стаў «візітнай карткай» універсітэта. Справаздачныя канцэрты, з якімі кожны год выступаюць студэнты факультэта — гэта свята ўсяго універсітэта, а калі гаварыць аб заключных канцэртах, то гэта ўжо свята горада. Такія калектывы, як «Валачобнікі», «Грамніцы», ансамблі «Туцці», «Дабравест», «Баламуты», вядомы і ў замежных дзяржавах: Польшчы, Германіі, Бельгіі, Францыі, ЗША.

Сёння мы павінны гаварыць не толькі аб поспехах, але і аб перспектывах развіцця.

Кафедрай духавой музыкі плануецца:

— распачаць, згодна з заключанымі пагадненнямі, падрыхтоўку спецыялістаў для вайсковых аркестраў Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства абароны РБ;

— стварыць рэгіянальныя аддзяленні спецыялізацыі ў абласных і раённых цэнтрах рэспублікі;

— распачаць падрыхтоўку кіраўнікоў ансамбляў беларускіх народных духавых інструментаў.

Кафедрай народна-інструментальнай творчасці плануецца:

— стварыць вучэбна-творчую майстэрню па вырабу беларускіх народных інструментаў;

— стварыць навукова-даследчую і вучэбна-творчую лабараторыю народнай музычнай творчасці;

— адкрыць платную нядзельную школу музычнага выхавання, арганізаваць на яе базе сектар практыкі;

— сабраць фанатэку з запісаў выканаўцаў на народных інструментах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На бліжэйшую перспектыву развіцця кафедра беларускай народнай песеннай творчасці плануе стварыць фальклорны тэатр-студыю.

У апошнія гады ўзнаўляецца старадаўняя духоўная музыка. У гэтай сувязі на кафедры харавога мастацтва створаны камерны хор «Дабравест» (кіраўнік А.Пякуцька), дзейнасць якога накіравана на адраджэнне старадаўняй музыкі Беларусі. Гэты калектыў павінен стаць своеасаблівай творчай лабараторыяй для паглыбленага знаёмства студэнтаў з вытокамі духоўнай харавой музыкі. Накірункамі дзейнасці кафедры харавога мастацтва з'яўляюцца стварэнне новых аўтарскіх твораў (Э.Наско), апрацовак і аранжыровак народных песень для розных саставаў вакальна-харавых калектываў, выданне рэпертуарных зборнікаў. Кафедрай харавога мастацтва плануецца ажыццявіць падрыхтоўку арганізатараў дзіцячай мастацкай творчасці, мастацкіх кіраўнікоў дзіцячых калектываў у дашкольных установах.

Вялікія надзеі ў развіцці спецыялізацыі кафедра харэаграфіі ўскладае на аднаўленне работы галіновай навукова-даследчай лабараторыі танцавальнай творчасці. Кафедра і надалей будзе працягваць традыцыю правядзення фальклорных вечароў -- своеасаблівых творчых справаздач студэнтаў па рабоце з нацыянальным фальклорам. Улічваючы патрэбу рэспублікі ў выкладчыках па рытміцы, кафедра харэаграфіі плануе падрыхтоўку такіх спецыялістаў.

Вывучаецца пытанне аб адкрыцці кафедры методыкі выкладання спецдысцыплін і арганізацыі вытворчай і педагагічнай практыкі.

Сёння ў рэспубліцы налічваецца пяць сярэдніх спецыяльных устаноў, якія рыхтуюць спецыялістаў нашага профілю. Ёсць думка зрабіць іх каледжамі пры Беларускім універсітэце культуры, узгадніць планы падрыхтоўкі спецыялістаў і, магчыма, стварыць асобныя планы з улікам пераемнасці ў навучанні.

Для ажыццяўлення планаў неабходна адпаведная матэрыяльная база. Універсітэт шмат чаго робіць для набыцця інструментаў, касцюмаў, але ў сувязі з недахопам фінансавых сродкаў поўнасцю патрэбы задаволіць нельга.

Некалькі слоў аб плануемай навуковай і навукова-метадычнай рабоце.

Кафедра духавой музыкі прадоўжыць работу над тэмай «Актуальныя праблемы духавой музыкі і сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў на сучасным этапе развіцця музычнай культуры Беларусі».

Кафедра народнапесеннай творчасці працягвае працаваць над навуковай тэмай «Фальклор як фактар абуджэння нацыянальнай самасвядомасці». Складзены перспектыўны план падрыхтоўкі вучэбных дапаможнікаў, хрэстаматый, рэпертуарных зборнікаў.

Выкладчыкі кафедры харавога мастацтва працягваюць работу над комплекснай тэмай «Месца вакальна-харавога мастацтва Беларусі ў развіцці славянскай музычнай культуры». Таксама плануецца выданне вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

З мэтай павышэння навуковай кваліфікацыі выкладчыкаў на кафедры харэаграфіі на бліжэйшыя 5 гадоў запланавана работа па дзвюх комплексных тэмах «Стан і праблема беларускай прафесійнай і аматарскай харэаграфіі» (кіраўнік Чурко Ю.М.) і «Харэаграфія ў ВНУ» (кіраўнік Гуткоўская С.В.). Плануюцца абарона кандыдацкай дысертацыі па праблеме гісторыі і тэорыі беларускага харэаграфічнага мастацтва, а таксама выданне навукова-метадычнай літаратуры: вучэбных дапаможнікаў, новых вучэбных праграм па харэаграфіі.

Кафедра эстраднага мастацтва прадоўжыць распрацоўку комплекснай тэмы «Беларуская эстрадная музыка». У распрацоўцы гэтай тэмы прымаюць удзел усе выкладчыкі кафедры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кафедра тэорыі музыкі будзе працягваць распрацоўку тэмы «Асноўныя стылістычныя тэндэнцыі музыкі беларускіх кампазітараў пасляваеннага перыяду» (харавая музыка — дац. Смагін А.І., сімфанічная, камерная музыка — дацэнт Каленька Р.Р., фартэпіянная музыка — дац. Ухава І.У., сімфанізм Аладава М.І.— ст.выкл. Кульша В.М.).

Як бачым, сёння мы можам не толькі падвесці вынікі работы факультэта за 10 гадоў, але і вызначыць накірункі яго развіцця як на бліжэйшую, так і на больш далёкую перспектывы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Высоцкі Г.В.**, *аспірант*

## ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ З ЭТАЛОННАЙ АСОБАЙ У ПРАЦЭСЕ ЎКЛЮЧЭННЯ ШКОЛЬНІКАЎ У МАСТАЦКА-ТВОРЧУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ

Працуючы з дзецьмі і штодзённа назіраючы за імі, педагогі неаднаразова звяртаюць увагу на тое, наколькі адрозніваюцца ад сваіх равеснікаў тыя школьнікі, жыццё якіх звязана з удзелам у творчай дзейнасці, у тым ліку і мастацкай. Сёння агульнапрызнана, што апошняя з'яўляецца фактарам, які ўздзейнічае на ўсе сферы жыцця дзіцяці, асабліва на маральную і эстэтычную.

Мастацка-творчая дзейнасць на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў разглядалася ў айчыннай педагагічнай навуцы ў кантэксце гуманістычнай дактрыны фарміравання ўсебакова развітай, гарманічнай асобы. Гэта садзейнічала выяўленню разнастайных падыходаў да дзіцячай мастацкай творчасці як каштоўнасці. Усе гэтыя падыходы аб'ядноўвае агульны прынцып, згодна з якім «кожнаму дзіцяці павінны ствараццa аптымальныя ўмовы для мастацкага выхавання, незалежна ад прырод-